Прэс-служба БНФ пра «маралістаў» з КДБ (стар. 3)
Еўропа хоча быць чысцейшай за Амерыку (стар. 6)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар
Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец – рэдакцыя
газеты СВАБОДА
Наклад 32.370
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул. Іванаўская, 56
Тэл./факс 2 362 441

Аўторак, 18 лістапада 1997 г. № 127 Кошт свабодны

Міны і бомбы на МТЗ

Учора ў палове адзінаццатай раніцы на Мінскі трактарны завод патэлефанавалі і паведамілі, што прадпрыемства замініраванае. Гэта ўжо другое тэлефоннае папярэджанне за апошнія чатыры дні.

Па звестках, атрыманых на заводзе, званіў мужчына. Сказаў, што закладзеная міна, якая выбухне на працягу трох гадзін. *«Кіраўніцтва завода адразу прыняло рашэнне аб эвакуацыі людзей,* — паведаміў карэспандэнту СВАБОДЫ намеснік начальніка службы бяспекі і рэжыму Ігар Мількота. — *Завод працуе па дзяжурным рэжыме: толькі самыя неабходныя тэхнічныя спецыялісты засталіся, каб падтрымліваць МТЗ у працоўным стане».*

У пятніцу, 14 лістапада, праца на МТЗ ужо спынялася пасля аналагічнага званка аб замініраванні. У той дзень «закладвалі» 5 бомбаў і тэлефанавалі а 7-й гадзіне раніцы (званіла жанчына). Людзей эвакуіравалі, аднак сапёры нічога не знайшлі.

І першы, і другі раз адпускалі з завода самую вялікую першую змену — гэта амаль 15 тысяч чалавек. *«Колькі каштавала спыненне працы, пакуль не падлічана,* — сказаў І.Мількота. — *Давядзецца выплаціць сярэдні заробак тым, каго адпусцілі дахаты, а тым, хто працаваў у дзяжурным рэжыме, — падвойны як у выхадныя».*

На момант здачы газеты ў друк ні міны, ні тэлефоннага тэрарыста не знайшлі, а дырэкцыя завода вырашала, ці выводзіць на працу другую змену.

Аляксандр ВАСІЛЕЎСКІ

Чуткі перабольшаныя

У мінулую пятніцу чарговая хваля чутак наконт Тамары Віннікавай падняла на ногі журналістаў. Сцвярджалася, быццам з ёю адбылося самае горшае.

Адвакат Тамары Віннікавай Гары Паганяйла абверг гэтыя чуткі і заўважыў, што падобныя размовы з'яўляюцца не ўпершыню. «Падобна на тое, што такімі плёткамі спрабуюць нанесці яшчэ адну маральную траўму жанчыне, на чыю долю і без таго выпала шмат выпрабаванняў», — заявіў СВАБОДЗЕ адвакат. Ён паведаміў, што ў мінулую пятніцу сустракаўся са сваёй падабароннай, якая адчувае сябе хоць і не лепшым чынам, але «здавальняюча».

Алесь ПАЎЛОВІЧ

Спекхард едзе ў Гомель

18-19 лістапада Пасол ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Дэніел Спекхард наведае Гомель — гэта першы афіцыйны візіт у абласныя цэнтры Беларусі з моманту прыезду амерыканскага дыпламата ў нашую краіну.

Сп. Спекхард плануе азнаёміцца з дзейнасцю мясцовых уладаў і няўрадавых арганізацыяў па пераадоленні наступстваў чарнобыльскай аварыі і аздараўленні насельніцтва, вывучыць магчымыя шляхі двухбаковага супрацоўніцтва ў гэтай галіне. Пасол ЗША таксама мае намер наведаць Амерыканскі інфармацыйны цэнтр па пытаннях адукацыі, дзе пройдзе яго сустрэча з удзельнікамі праграм адукацыйных абменаў, фінансаваных урадам ЗША. Д.Спекхард наведае таксама адну з гомельскіх бальніц і рэабілітацыйны цэнтр, дзе знаходзяцца на лячэнні людзі, якія пацярпелі ад наступстваў чарнобыльскай аварыі. Плануецца паездка пасла ЗША і ў зону адсялення.

БелаПАН

Дэманстрантаў пасадзілі ўмоўна

Упершыню ўдзельнікі апазіцыйных дэманстрацыяў прызнаныя крымінальнымі злачынцамі

Судовая калегія мінскага гарадскога суда на чале з суддзёй М.Самасейкам прызнала вінаватымі мінчанаў Р.Кійко, У.Лыско, А.Бандарава, А.Каваля і А.Сарокіна і прысудзіла ім розныя тэрміны пакарання (умоўна).

Удзельнікам «несанкцыянаванага» шэсця ў гонар 79-х угодкаў БНР, якое адбылося сёлета 23 сакавіка, інкрымінаваліся парушэнні, што падпадаюць пад асобныя часткі арт. 186 і 187 Крымінальнага кодэкса. У прыватнасці, іх абвінавачвалі ў «супраціўленні супрацоўнікам міліцыі падчас выканання службовых абавязкаў» і «агрэсіўных дзеяннях з нанясеннем шкоды». Па версіі пракуратуры, дэманстранты «білі» міліцыянтаў дрэўкамі сцягоў, «хапалі за вопратку», «рабілі супраць іх удушаючыя прыёмы» і нават «білі нагамі». Гэта сцвярджалі ў судзе супрацоўнікі міліцыі Бухавец, Прыходзька, Каспяровіч, Штэйн ды іншыя «пацярпелыя».

Яшчэ адным доказам віны дэманстрантаў сталі відэастужкі падзеяў 23 сакавіка, якія прадставіла міністэрства ўнутраных спраў. У выніку суд палічыў віну абвінавачаных даказанай і вызначыў ім наступнае пакаранне: Рыгору Кійко і Уладзіміру Лыско — па два гады ўмоўнага зняволення з прыцягненнем да прымусовай працы на аб'ектах гаспадаркі (у народзе такое пакаранне завуць «хіміяй»). Дзе дакладна будуць два гады «хімічыць» мастак Рыгор Кійко ды геолаг Уладзімір Лыско, вырашаць адміністратыўныя органы. Калі за гэтыя два гады асуджаныя зробяць новае злачынства або хаця б двойчы парушаць адміністратыўны кодэкс, умоўнае зняволенне ператворыцца для іх у сапраўднае сядзенне «на нарах». Астатнім — Аляксандру Бондараву, Аляксею Кавалю і Анатолю Сарокіну — пашанцавала больш. Ім суд прызначыў двухгадовыя «папраўчыя работы» па месцы працы з утрыманнем 20% заробку на карысць дзяржавы.

Напярэдадні працэсу ніводны з абвінавачаных не прызнаў сваю віну цалкам, і толькі Уладзімір Лыско часткова — ён пагадзіўся, што ўдзельнічаў у дзеяннях, у выніку якіх быў спынены рух грамадскага транспарту. Не пагадзіліся з рашэннем суда асуджаныя і пасля абвяшчэння прысуду. *«Мы чакалі, што з намі расправяцца за нашую палітычную дзейнасць, і гэта адбылося»,* — заявіў СВАБОДЗЕ Рыгор Кійко. На ягоную думку, улада вядзе сапраўднае паляванне на тых, хто ўдзельнічае ў акцыях пратэсту, каб запалохаць грамадства і прымусіць яго моўчкі ўспрымаць любыя дзеянні кіраўніцтва краіны.

Кійко па-ранейшаму сцвярджае, што «дэтанатарам» сутычак міліцыі з дэманстрантамі 23 сакавіка сталі правакацыі саміх жа сілавікоў. *«Да плошчы Якуба Коласа мы ішлі на прызначаны мітынг па тратуарах, пераходзілі вуліцы на зялёнае святло»,* — расказвае другі асуджаны, Аляксандр Бондараў. Па ягоных словах, сутычак можна было б пазбегнуць, калі б насупраць кафэ «На ростанях» міліцыя не пачала хапаць людзей і цягнуць з тратуараў у свае машыны. *«Мы вымушаныя былі бараніць сябе»,* — сцвярджае сп.Бондараў.

Дадатковым вынікам працэсу стала яшчэ адна судовая гісторыя. У перадапошні дзень слуханняў суддзя Самасейка заявіў, што па ягонай ініцыятыве ўзбуджаная адміністратыўная справа супраць вядомага адваката Надзеі Дударавай, якая на працэсе выступала ў якасці грамадскага абаронцы абвінавачаных. Як сцвярджаў суддзя, у сваёй прамове Дударава быццам бы заявіла, што суд выконвае «сацыяльны заказ». *«Проста я выказала сваю ўпэўненасць у тым, што на суд аказваецца ціск з боку ўлад, і таму я не веру ў апраўдальны вердыкт па цалкам, на маю думку, сфальсіфікаванай справе»,* — патлумачыла сваю пазіцыю Надзея Дударава.

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Крэмль шануе Васіля Быкава

У мінулы чацвер Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Расійскай Федэрацыі Валерый Лашчынін уручыў ордэн Дружбы Васілю Быкаву.

Як гаворыцца ў прэс-рэлізе расійскай амбасады, *«буйнейшы беларускі пісьменнік удастоены высокай дзяржаўнай узнагароды за вялікі ўклад у развіццё сучаснай літаратуры і актыўную грамадскую дзейнасць».*

Прэзідэнт Барыс Ельцын падпісаў указ аб узнагароджанні Васіля Быкава яшчэ ў 1994 годзе з нагоды 70-гадовага юбілею пісьменніка. Узнагарода знайшла героя толькі праз тры гады. У расійскай амбасадзе патлумачылі, што затрымка адбылася «па тэхнічных прычынах». Маўляў, спачатку хацелі ўручыць у Маскве, а потым вырашылі ў амбасадзе ў Мінску. Расійскія дыпламаты спахапіліся пра ордэн толькі цяпер і «пачалі шукаць узнагароджанага».

На працягу трох гадоў беларускія ўлады не пускалі ордэн у Мінск, а міністэрства замежных справаў сказала рашучае «не» расійскім калегам. Гэтая скандальная гісторыя трапіла ў прэсу: газета «Известия» пісала ў свой час, што *«гэты ганебны факт, які абурыў пісьменніцкую грамадскасць Масквы, варты таго, каб пра яго даведаліся і ў Расіі, і ў Беларусі».* Тагачасны кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства Пётр Краўчанка тлумачыў у інтэрв'ю, што ён асабіста не мае ніякага дачынення да гэтай гісторыі. Паказальна, што да ордэна Дружбы Васіля Быкава прадставіў маскоўскі саюз пісьменнікаў і расійскі ПЭН-цэнтр. А 70-гадовы юбілей пісьменніка БНФ адзначаў у мінскім скверы імя Янкі Купалы, пад дажджом.

Сам Васіль Быкаў сказаў карэспандэнту СВАБОДЫ, што ён *«не хацеў, каб гэтая камедыя працягвалася, таму ўзяў ордэн у амбасадзе і закрыў праблему».* Калі тры гады міністэрства замежных справаў было катэгарычна супраць узнагароды Быкаву, то цяпер было вымушанае падцяць хвост. А міністр Іван Антановіч па ўласнай ініцыятыве прыбег у расійскую амбасаду на цырымонію ўручэння і нават выказаўся на беларускай мове. МЗС палагоднела, бо Крэмль цяпер выказаўся вельмі катэгарычна і тэрмінова прыслаў ордэн Быкаву ў Мінск. Як сцвярджаюць у расійскай амбасадзе, па просьбе Васіля Быкава цырымонія прайшла ў сціплай абстаноўцы, а не ў прысутнасці шырокай грамадскасці. Менавіта так, сціпла год таму ўручалі пісьменніку ордэн Італьянскай Рэспублікі «За заслугі».

Па словах народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, які прысутнічаў на цырымоніі ў амбасадзе, *«Расія цэніць Быкава, хоць многа можна было чуць, што Быкаў антырасійскіх настрояў. Гэта вельмі добры жэст Расіі, якая цэніць нашых нацыянальных геніяў, падкрэслівае сваю ўзважаную, нармальную пазіцыю — у супрацьвагу непрызнання генія Быкава афіцыйнымі ўладамі Беларусі».*

З нагоды ўручэння ордэна Дружбы мы патэлефанавалі шаноўнаму Васілю Быкаву і папрасілі пракаментаваць беларуска-расійскія дачыненні.

«Яны яшчэ болей абвастрыліся за гэтыя гады, — сказаў народны пісьменнік. — *Я разумею, што беларуская нацыянальная дэмакратыя ніколі не пойдзе па лініі гэтай самай, імперскай інтэграцыі з вялікадзяржаўнай Расіяй. У гэтым сэнсе, я лічу, нашая дэмакратычная эліта павінна мець узаемадзеянне з расійскай дэмакратыяй. Няхай яна ў адносінах да Беларусі трымаецца вельмі невыразнай пазіцыі, але тым не менш трэба нейкім чынам кантактаваць і дзейнічаць дзеля развіцця нашых культур, захавання суверэнітэту і незалежнасці Беларусі».*

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Росквіт пад канвоем

Нешчаслівы дзень дэпутата Шчукіна



13 лістапада дэпутат Вярхоўнага Савета 13-га склікання і журналіст Валерый Шчукін быў дапытаны ў пракуратуры Савецкага раёна Мінска — як падследны па крымінальнай справе.

Справа ўзбуджаная па арт. 188 Крымінальнага кодэкса — «знявага прадстаўнікоў улады». Гэты артыкул прадугледжвае пакаранне ў выглядзе папраўчых работ тэрмінам да аднаго года або штраф. В.Шчукін абвінавачваецца ў выступленні на мітынгу 30 жніўня, які праводзіўся ў абарону свабоды слова ў Беларусі, а таксама ў знак салідарнасці з Паўлам Шараметам і Дзмітрыем Завадскім, якія ў той час знаходзіліся пад арыштам. Справу вядзе следчы Сяргей Сяменаў, следства сцвярджае, што, выступаючы на мітынгу, дэпутат дазволіў сабе дастаткова рэзкія выказванні ў адрас А.Лукашэнкі. Валерый Шчукін заяўляе, што не баіцца суда і гатовы даказаць справядлівасць сваіх выказванняў.

У той жа дзень 13 лістапада Мінгарвыканкам адмовіў Валерыю Шчукіну ў яго заяўцы на правядзенне 23 лістапада шэсця ад плошчы Якуба Коласа да плошчы Незалежнасці і мітынгу, прысвечанага гадавіне лістападаўскага рэферэндуму 1996 года. Кіраўніцтва сталічнага выканкама засумнявалася, што такі «злосны парушальнік закона», якім з'яўляецца Валерый Шчукін, зможа забяспечыць неабходны парадак пры правядзенні масавага мерапрыемства.

БелаПАН

Горкі смак свабоды слова

Якая ўлада — такія і афіцыйныя газеты

Сустракаю днямі супрацоўніка афіцыйнай газеты, свайго былога калегу. *«Ну што, — пытае, — шукаеш інфармацыю?»* — *«Як заўсёды»*, — адказваю. *«Цяжка вам, — гаворыць, — чытачы заўсёды чакаюць ад вас нечага цікавага. А ў нашай рэдакцыі ўсё проста».*

Яшчэ нядаўна на планёрках у гэтай газеце таксама патрабавалі цікавыя навіны і смелыя публікацыі. Цяпер вярнуліся брэжнеўскія часы, галоўнае — «тэма дня». Прамовы генсека, прабачце, прэзідэнта — гэта і ёсць самае актуальнае. Вярнулася і добра забытая, але ідэалагічна бяспечная тэматыка — апісанне сельгаспрацэсаў. На першай старонцы цяпер зноў друкуюць рэляцыі пра запасы фуражу, надоі і вываз угнаення на палеткі. І самае смешнае, што прыязджаў днямі вядомы сталініст з прэзідэнцкай адміністрацыі, каб справіцца, як адлюстроўваецца журналістамі дзейнасць уладаў, дык, пагартаўшы падшыўку, сказаў, што газета — «шэрая». Але ж якая ўлада, такая і газета! Параўнайце тыраж з тым, што быў у больш-менш дэмакратычныя гады — удвая зменшыўся!

Вельмі сімптаматычна, што ў гродзенскіх дзяржаўных *mass media* мне яшчэ не даводзілася сутыкнуцца з «лукашыстам». Ёсць, напэўна, і такія, але большасць разумее: тое, што адбываецца сёння, — маразм. Бо для журналістаў уласціва імкненне да незалежных поглядаў, да праўды, да свабоды слова, якая з'яўляецца сутнасцю журналісцкі. Наракае пры сустрэчы ўласны карэспандэнт рэспубліканскай газеты: пра гэта нельга пісаць, пра тое таксама і пра гэта не пішы — так яго рэдактар арыентуе ў «сучасных» тэматыцы. Журналістка, якая ўжо пакаштавала свабоду слова, мусіла вярнуцца ў афіцыйную газету, але кажа, што працаваць агідна. Перадрукавала з маскоўскай газеты падборку анекдотаў, дык быў скандал — знайшлі нейкі намёк на нейкага прэзідэнта. Таму, маўляў, і даводзіцца друкаваць кулінарныя рэцэпты, калі нават у анекдотах знаходзяць крамолу.

А вось якія дробныя метады цэнзуры выкарыстоўваюцца на радыё. У Гродне сёлета была створана новая дэмакратычная арганізацыя. Журналіст, які падрыхтаваў паведамленне пра гэта, сказаў, што ўзначаліў яе «вядомы ў Беларусі палітык», і назваў ягонае прозвішча. Мясцовая рэдактура выразала словы наконт «вядомага палітыка». А калі нататка прагучала па рэспубліканскім радыё, з яе знікла нават прозвішча гэтага чалавека. Ён у апазіцыі да Лукашэнкі, а значыцца, яго нельга ўзгадваць нават у нейтральнай інфармацыі, можна толькі ганьбіць, што, між іншым, неўзабаве пацвердзіў публічна сам Рыгоравіч.

Класічным прыкладам «прывадных рамянёў» вертыкалі сталі раённыя газеты. Яшчэ нядаўна там можна было сустрэць развагі пра жыццё і палітыку, меркаванні людзей розных палітычных поглядаў, а часам нават крытыку ў адрас тых, хто знішчае дэмакратыю і суверэнітэт. Сёння самае цікавае ў іх — толькі крымінальная хроніка: хто дзе напіўся і каго забіў сякерай.

Пракурорскі тон Рыгоравіча адносна незалежнай прэсы — рэч вельмі заразлівая. Напісаў я нядаўна нататку ў СВАБОДЗЕ пра пленум абкама БПСМ. Адразу лісты грозныя — з абкама ды з цэха, абвяржэнне, пагражаюць судом, ківаючы на закон аб друку. Так, сапраўды, былі ў той нататцы дзве недакладнасці. Сем членаў напісалі заявы, жадаючы выйсці з абкама БПСМ, але яны не выходзілі з самой арганізацыі (тут я памыліўся). Другая недакладнасць: яны не з'яўляліся членамі бюро. А ўзніклі недакладнасці па той прычыне, што мне перашкодзілі атрымаць інфармацыю з першых рук, што гарантуе закон. Прычым, перашкодзілі самі прадстаўнікі абкама, якія не дапусцілі на свой пленум мяне і карэспандэнта яшчэ адной незалежнай газеты. Паразмаўлялі мы на гэтую тэму з кансультантам першага сакратара абкама Вячаславам Сакаловым і, можна сказаць, прызналі ўзаемныя памылкі. Вырашылі, што журналістам трэба не перашкаджаць, а наадварот — дапамагаць у пошуках дакладнай інфармацыі. Паглядзім, як яно будзе на практыцы...

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

Народны універсітэт палітыкі

У Гомелі распачаў работу Народны універсітэт. Ва ўстаноўчым сходзе ўзялі ўдзел вядомыя палітыкі і палітолагі Ю.Хадыка, В.Івашкевіч і В.Карбалевіч.

У праграму заняткаў увойдуць абавязковыя курсы: паліталогія і геапалітыка, гісторыя і гісторыя культуры, эканамічнае рэфармаванне, а таксама факультатыўны курс па выбары слухачоў. Заняткі, якія па суботах і нядзелях будуць праводзіць вядомыя ў краіне спецыялісты ў галіне палітыкі — сярод лектараў У.Калужанка, І.Нікітчанка, Л.Гразнова, М.Пастухоў, В.Чарноў і інш. — распачнуцца 29 лістапада.

Уладзімір ВАЛЕЎСКІ

Імша будзе з музыкай

У касцёле вёскі Квасоўка каля Гродна біскуп А.Кашкевіч асвяціў адрамантаваныя арганы.

Інструмент быў створаны больш як сто гадоў таму, а дакладней — у 1885 годзе. Але апошнія 50 гадоў арганы не працавалі. Адрамантавалі касцельны інструмент мінскія майстры Чарняўскія.

С.М.

Дзве з паловай тоны адзення

У Астравецкім раёне быў затрыманы аўтобус «Вольва», у якім тры літоўцы везлі 2,5 тоны адзення.

Высветлілася, што яны легальна пераехалі літоўска-беларускую мяжу ў памежным пункце «Катлоўка», але не заплацілі мытны збор амаль на 12 тысячаў долараў. Аказалася, што іх прапусціў інспектар мытні Ш. Заведзена крымінальная справа.

Мар'ян ВЯНГРОЎСКІ

Жывем па сродках, значыць — бедна

Канец года заўсёды складаны для міністэрства эканомікі — даводзіцца даваць ацэнку магчымым вынікам развіцця народнай гаспадаркі за год. А таксама закладваць гэтыя ацэначныя параметры ў прагноз на наступны год. Напрыканцы тыдня са справаздачай за пражыты адрэзак 1997 года перад журналістамі выступіў міністр эканомікі У.Шымаў.

«Пачатак выхаду з крызісу мы заклалі ў 1996 годзе», — У.Шымаў паставіў пункт адліку напачатку сустрэчы. *«Тады з'явілася першая прыкмета эканамічнага росту, а сёлета мы пастараемся, каб парасткі замацаваліся»*, — метафарычна працягваў міністр. *«Аднак радавацца рана: ёсць шмат праблем»*, — прызнаецца Шымаў, — *на якія мы да канца не ведаем адказу».* Зрэшты, на праблемы не адказваюць, іх вырашаюць, але ў нашага міністэрства асаблівы стыль працы.

Па словах Уладзіміра Шымава, валавы ўнутраны прадукт (ВУП) сёлета вырасце на 11-12%, а каб яшчэ было добрае надвор'е, дык справы былі б зусім добрыя, а так — «з-за дрэннага надвор'я» не ўрадзіла асноўная сельскагаспадарчая культура краіны — бульба, патлумачыў Шымаў. *«А вось што сапраўды вырасла больш, чым чакалася, — гэта інфляцыя: ідзе з апярэджаннем у два разы»*, — сказаў У.Шымаў. — *Будзе — 4,5-4,7% у месяц, чакалі — 2-2,5%».*

У 1997 годзе сальда будзе адмоўным, дэфіцыт складзе 1,1 мільярда долараў — 10% ад ВУП. *«Адмоўнае гандлёвае сальда — атрыбут практычна любой эканомікі»*, — супакойвае Шымаў. *«Адмоўнае сальда ў Беларусі не настолькі вялікае, каб гаварыць, што мы праводзім не тую палітыку»*, — упэўнены міністр.

Дзе ў Беларусі «вялікая дзірка» — дык у інвестыцыйных рэсурсах, лічыць міністр. Знешняе крэдытаванне і прамыя інвестыцыі заблакіраваныя. Беларусь ужо другі год завяршае без знешняга крыдытавання (фактычна развіваецца за лік унутраных рэсурсаў), а прамыя інвестыцыі мізэрныя, крыху большыя за 50 мільёнаў долараў. Такім чынам, *«жывём мы па сродках»*, — сказаў міністр, — *таму і не так багата, як бы хацелася».* Дарэчы, знешні доўг Беларусі, па думку У.Шымава, «невялікі», каля 1 мільярда долараў.

На пытанне аднаго журналіста, як адбілася на беларускай эканоміцы вайна з *«гразнымі предпринимателями и банкирами»*, Шымаў адказаў, што «закручванне гаек» на макраэканамічным узроўні не адаб'ецца. *«Стала лягчэй дыхаць, — сказаў міністр. — Лягчэйшы кісларод стаў».* Намеснік міністра эканомікі Мікалай Зайчанка пераняў вобразна-некакрэтны стыль свайго шэфа і сказаў: *«Ваўкоў баяцца — у лес не хадзіць».* Што ён меў на ўвазе? Дзе той лес? І хто наступны воўк?

Аляксандр ВАСІЛЕЎСКІ

Салідарнасць магілёўскіх журналістаў

Напярэдадні прыезду А.Лукашэнкі ў Магілёве разгараўся скандал: старшыня аблвыканкама Аляксандр Куліччоў запатрабаваў ад рэдакцыі абласной газеты «Магілёўскія ведамасці» зняць крытычны матэрыял пра няўбраны ўраджай.

Калектыў газеты здолеў супрацьстаяць кіраўніку мясцовай «вертыкалі» і апублікаваў той артыкул, а абласное тэлебачанне выказала ў эфіры салідарнасць з калегамі. Трэба адзначыць, што паўгода таму тэлежурналісты таксама сутыкнуліся з «крыўдлівасцю» мясцовай адміністрацыі: пасля крытычнай перадачы магілёўскі губернатар А.Куліччоў катэгарычна адмовіў супрацоўнікам мясцовага тэлебачання ў кантактах.

БелаПАН

І варагі, і грэкі

Праваслаўныя парламентарыі сустрэліся ў Мінску

За час прэзідэнцтва Лукашэнкі такія ўплывовыя міжнародныя структуры, як Савет Еўропы і АБСЕ, абмежавалі кантакты з афіцыйным Мінскам, але ў арганізацыях менш уплывовых Беларусь захавала афіцыйнае прадстаўніцтва. Адной з такіх арганізацыяў з'яўляецца Еўрапейская міжпарламенцкая асамблея праваслаўя (ЕМАП), пашыранае паседжанне сакратарыята якой прайшло на мінулым тыдні ў Мінску.

Ініцыятыва стварэння ЕМАП, якая б аб'ядноўвала праваслаўных прадстаўнікоў еўрапейскіх парламентаў, належыць дэпутатам парламента Грэцыі. У 1994 годзе ў Афінах прайшла ўстаноўчая канферэнцыя гэтай арганізацыі, у рабоце якой брала ўдзел дэлегацыя ВС Беларусі. Цяпер у склад асамблеі ўваходзяць парламентарыі 18 еўрапейскіх краінаў. Мэтай ЕМАП, згодна яе статуту, з'яўляецца актывізацыя міратворчых намаганняў праваслаўнага насельніцтва Еўропы ў пераадоленні міжканфесійных супярэчнасцяў, пашырэнне кантактаў паміж палітычнымі, царкоўнымі і навуковымі дзеячамі.

Як паведамілі на прэс-канферэнцыі дэпутат прэзідэнцкай ніжняй палаты Ігар Катляроў, асамблея праваслаўя ўхваліла дзейнасць Лукашэнкі па інтэграцыі славянскіх і праваслаўных народаў, менавіта таму кіраўніцтва ЕМАП вырашыла правесці паседжанне свайго сакратарыята ў Беларусі. Праваслаўныя парламентарыі былі прынятыя асабіста Рыгоравічам, а таксама сустрэліся з мітрапалітам Філарэтам і «палатачнымі» беларускімі дэпутатамі. Генеральны сакратар ЕМАП Стылянас Папатамеліс з Грэцыі сцвярджаў, што яго арганізацыя прытрымліваецца прынцыпаў дэмакратыі і захавання правоў чалавека. Аднак ён адмовіўся ацэньваць сітуацыю з захаваннем гэтых прынцыпаў у Беларусі, спасылаўшыся на тое, што ЕМАП не ўмешваецца ва ўнутраныя справы краінаў — членаў арганізацыі.

Што ж на самой справе ўяўляе сабою ЕМАП і наколькі ўплывовая гэтая арганізацыя? Па каментар мы звярнуліся да дэпутата ВС 13-га склікання Анатоля Лябедзькі, які ў 1993 годзе ўзначальваў беларускую парламенцкую дэлегацыю на з'ездзе праваслаўных парламентарыяў Еўропы, дзе і нарадзілася ідэя стварэння ЕМАП.

На думку А.Лябедзькі, першапачатковая ідэя аб'яднання праваслаўных парламентарыяў Еўропы для вырашэння агульнаеўрапейскіх праблемаў была добрай. Але цяпер стала бачна, што гэтую структуру, у кіраўніцтве якой нямала людзей з недэмакратычнымі поглядамі, выкарыстоўваюць у сваіх мэтах палітыкі тыпу Лукашэнкі. Пацвярджэннем гэтаму з'яўляецца і правядзенне менавіта ў Мінску паседжання сакратарыята ЕМАП. *«Лукашэнка выкарыстоўвае любыя магчымасці выхаду на міжнародную арэну*, — гаворыць А.Лябедзька. — *Але дарэмна ён спадзяецца, што прарыў у Еўропу можна здзейсніць пры дапамозе такой малааўтарытэтнай арганізацыі. ЕМАП не мае ніякага ўплыву на Захадзе. Таму прыезд праваслаўных парламентарыяў у Беларусь — хутчэй за ўсё прапагандысцкая акцыя, якая павінна паказаць нашаму электарату, што ў кантактах з Захадам у беларускіх уладаў няма праблемаў».*

Альгерд НЕВЯРОЎСКІ

КАДРЫ

Верховный Совет готов себя признать

Группа депутатов Верховного Совета во главе с Виктором Гончаром разработала пакет материалов для подготовки и проведения правомочных заседаний Верховного Совета. Верховный Совет рассмотрит этот вопрос 22 ноября.

Известные юристы В.Гончар и В.Тихиня обсуждают...

Каждому из 198 депутатов направлено письмо за подписью председателя ВС Семена Шарецкого. В письме предлагается до 20 ноября подтвердить готовность участвовать в работе Верховного Совета или же официально заявить о прекращении своих полномочий депутата ВС. Последнее, впрочем, не имеет особого значения в отношении «палатников». Как известно, состав «палаты представителей» был назначен Лукашенко. А согласно ст. 92 Конституции (что подтверждено и соответствующими законами), *«депутатами Верховного Совета не могут быть лица, которые назначаются на должность президентом либо по согласованию с ним»*. Проект постановления на данном основании лишает «палатников» депутатских полномочий. Другое дело, что если какие-то «палатники» вдруг изъявят готовность работать в Верховном Совете, то, учитывая специфику теперешней белорусской ситуации, вопрос по каждому из таких будет решаться индивидуально.

Если раньше «палатники» могли рассчитывать на то, что в случае изменения политической ситуации они ничего не потеряют — просто вернутся себе в Верховный Совет, — то теперь каждый поставлен перед персональным выбором. А это само по себе имеет значение — хотя и нетрудно предугадать, каким будет этот выбор для подавляющего большинства из них.

Таким образом, от прежнего количества депутатов (198 человек) будут отминусованы «палатники», а также депутаты, которые подадут заявления о сложении с себя полномочий. Соответственно, исходя из новой численности депутатов, сохранивших свои полномочия, будет определяться и новый кворум для проведения правомочных заседаний и принятия решений. В проекте постановления оговаривается, что новый численный состав депутатов устанавливается *«временно, до проведения довыборов в Верховный Совет»*.

К пакету материалов приложена историческая справка о том, что действия Лукашенко *«имеют достаточно прямую аналогию с действиями фашистских партий Германии, Италии, Испании при ликвидации парламентаризма и установлении тоталитарного режима»*. Такого рода параллели действительно напрашиваются. Так, Франко следующим образом определял задачу парламента: *«Подготовка и разработка законов без ущерба для полномочий главы государства»*. Муссолини, охаивая парламентскую демократию, заявил: *«Фашизм заменил споры делами»*. А Гитлер, который не получил необходимого большинства голосов в парламенте и начал ликвидацию парламентаризма, утверждал, что правительство не должно *«вести переговоры и просить разрешения у рейхстага по каждому случаю»*. Однако, по мнению Гитлера, правительство *«не имеет никакого намерения ликвидировать рейхстаг и его функции; напротив, оно оставляет за собой право держать его время от времени в курсе мер, которые собирается предпринять, и, если сочтет это необходимым, просить одобрения у парламента»*. Парламент, как известно, формально существовал все время правления Гитлера. Разве не сходная роль у нашей «палаты», которую тоже «держат время от времени в курсе мер» и у которой «просят одобрения, если сочтут необходимым»? Что ж, это лишний раз подтверждает, что высказанное в свое время нашим диктатором восхищение политикой Гитлера не было случайной обмолвкой.

О необходимости восстановления правомочности Верховного Совета говорилось уже давно. Судя по всему, в двадцатых числах ноября Верховный Совет сделает этот шаг. Как раз в двадцатых числах ноября прошлого года парламент был разогнан. В правовом плане для решения проблемы легитимизации Верховного Совета было достаточно, оказывается, всего лишь внимательно почитать Конституцию. Но дело не только в юридическом аспекте. Отрадно, что депутаты наконец готовы проявить политическое (да и просто человеческое) мужество и волю к борьбе. Будущее покажет, какие шансы предоставятся оппозиции и как она их использует. Но, как бы там ни было, на результат можно рассчитывать лишь в том случае, когда что-то делается, когда предпринимаются какие-то усилия. Не прошло и года, как депутаты, похоже, это поняли.

Однако, каким бы легитимным с юридической точки зрения ни был Верховный Совет, — ясно, что любые законы и решения, которые он примет, могут иметь разве что пропагандистское значение. Их не будут даже принимать всерьез — до тех пор, пока все рычаги реальной власти будут находиться в руках диктатора. Поэтому, несомненно, центральным вопросом, который предстоит решать Верховному Совету, будет доведение до конца начатой комиссией Гончара процедуры импичмента Лукашенко. Хотя об этом тоже пока можно говорить только в правовом плане — но здесь есть возможности добиваться успеха и в плане политическом.

Важность вопроса об импичменте осознается и режимом. Не случайно по поводу заключения специальной комиссии, в котором признается наличие в действиях Лукашенко признаков преступления, заведено уголовное дело за «клевету в отношении главы государства». Любопытно, что, в связи с этим делом, первым государственным органом, фактически признавшим Верховный Совет, стала столичная прокуратура. На официальном бланке прокуратуры значится: *«Председателю Верховного Совета Республики Беларусь С.Г.Шарецкому»*; следователь по важнейшим делам Г.Бурштын просит Семена Георгиевича *«передать в прокуратуру г.Минска копию протокола заседания (собрания депутатов) Верховного Совета 13-го созыва от 14 октября 1997 г.»* (т.е. последнего заседания, на котором депутаты согласились с выводами специальной комиссии и тем самым приостановили президентские полномочия Лукашенко до принятия Верховным Советом окончательного решения).

Отвечая на запрос прокуратуры, Президиум ВС привел ссылки на статьи Конституции и законов, из которых следует, что в обязанности председателя ВС *«не входит предоставление информации о деятельности отдельных депутатов и Верховного Совета в целом»* и поэтому *«не имеется правовых оснований для предоставления прокуратуре требуемой информации»*. В неофициальном же разговоре следователю Бурштыну посоветовали обратиться к Шейману: в Совете безопасности наверняка имеется полная и точная стенограмма того заседания.

Вадим КАЗНАЧЕЕВ

Дакладчык Савета Еўропы меў гутарку з Сямёнам Шарэцкім

І катэгарычна адмовіўся ад сустрэчы з Паўлам Шыпуком

«У мяне няма сумнення, што правячы рэжым у Беларусі з'яўляецца па сваёй сутнасці дыктатарскім, а таму без сур'ёзных зрухаў у бок дэмакратыі Беларусь па-ранейшаму будзе ізалявана ад еўрапейскай супольнасці».

Такую заяву зрабіў асноўны дакладчык па Беларусі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Клод Фрэй падчас сустрэчы са Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларусі 13-га склікання Сямёнам Шарэцкім і членам аргкамітэта руху «Хартыя-97» Андрэем Саннікавым, якая адбылася 14 лістапада. Па словах Клода Фрэя, вярнуцца да пытання аб прыняцці Беларусі ў Савет Еўропы можна будзе толькі ў тым выпадку, калі ў краіне *«будуць адзначаны рэальныя крокі ў накірунку да дэмакратыі»*. Ацэньваючы сваю місію, высокапастаўлены еўрапейскі чыноўнік назваў яе *«вельмі складанай»*, а сітуацыю ў Рэспубліцы Беларусь — *«вельмі цяжкай»*. Клод Фрэй падзяляе пазіцыю еўрапейскіх арганізацый, якія лічаць, што цяперашні беларускі парламент прызначаны, а не абраны законным шляхам. Зыходзячы з гэтага, асноўны дакладчык па Беларусі катэгарычна адмовіўся ад прапанаванай яму сустрэчы з кіраўніком верхняй палаты Нацыянальнага сходу Паўлам Шыпуком.

Падчас гутаркі было дамоўлена, што кіраўніцтва Вярхоўнага Савета 13-га склікання будзе пастаянна інфармаваць Клода Фрэя аб сітуацыі ў Беларусі.

БелаПАН

Перапіска

Прэс-служба БНФ пра «маралістаў» з КДБ

Апошнім часам на старонках газет з'явіўся незвычайны дакумент пад інтрыгуючай шапкай «ФАКС ИЗ КГБ». Ягоная незвычайнасць у тым, што прадстаўнікі «недремлющего ока» ды «карающего меча» спрабуюць апраўдацца. Прычым спрабуюць зрабіць гэта з пазіцый высокай маралі і законнасці.

Апроч таго, нашчадкі «железного Феликса» і «любвеобильного» Цанавы не ва ўласцівай ім манеры задаюць рытарычныя пытанні: маўляў, *«...зачем потребовалось наносить ущерб репутации молодой женщины и ее семьи... Уж не сделано ли это в угоду сохранению пошатнувшегося имиджа отдельных горе-политиков, готовых пожертвовать человеческими судьбами ради спасения собственной шкуры?»* Пытанні, як бачыце, «с обвинительным уклоном».

Незвычайнасць зместу факса з КДБ яшчэ ў тым, што ў ім даверліва паведамляецца, як падчас «беседы» са следчым КДБ маладая жанчына *«инициативно сообщила о другом уголовном преступлении»*. Натуральна, што пасля гэтага следчы *«порекомендовал ей обратиться по компетенции с соответствующим заявлением в органы милиции»*.

Які шляхетны (ці неахайны?) следчы! Трэба ж — ведаў пра жахлівае злачынства, а справу сам не ўзбудзіў. І нават, трэба разумець, не запратакаліраваў і сам у міліцыю не паведаміў. Чаму? Чаго ж так напужаліся «рыцари плаща и кинжала», факсануўшы ва ўсе газеты? Адкуль у іх з'явілася гэтае нечаканае імкненне да высокай маральнасці і законнасці ды яшчэ такі бацькоўскі клопат пра маладую сям'ю? З чаго б ім гэта так закарцела нарэшце не бэсціць, а вучыць актывістаў Беларускага народнага фронту, якім чынам тым захоўваць свой імідж ды клапаціцца пра людскія лёсы?

Адказы на гэтыя пытанні сёння ляжаць на паверхні.

25 жніўня г.г. у Стоўбцах арыштавалі 18-гадовага А.Шыдлоўскага за тое, што ён пісаў на плоце: ЛЮБЛЮ БЕЛАРУСЬ, ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ, НЕ ЛЮБЛЮ ПРЭЗІДЭНТА... Вось за гэта выключанага раней з БДУ за «палітыку» студэнта пасадзілі на турэмныя нары. Разам з ім у турэмны «універсітэт» кінулі 16-гадовага школьніка Вадзіма Лабковіча.

Да падобных рэчаў прывыкнуць увогуле цяжка, але тое, што пачалося далей, у нармальнага чалавека нічога, апроч болю і абурэння, выклікаць не можа. У факсе з КДБ здзек з маладых людзей прэзентаваны як «беседа следователя КГБ с И.Пименовой 16 октября».

У сапраўднасці жонку Шыдлоўскага Іну дапытвалі ў КДБ шмат разоў, пра што сведчаць позвы і даведкі ад 18, 22, 24 верасня, 16 кастрычніка, падпісаныя «Шершень Э.И». Прычым на некаторыя допыты студэнтку Піменаву спрабавалі забіраць проста з лекцый, садзілі ў аўтамабіль з адмысловымі нумарамі, імкнуліся запалохаць. Жонку палітвязня выклікалі на допыт «у якасці сведкі», аднак, не ў пракуратуру, а менавіта ў КДБ! У сваім факсе прэс-цэнтр КДБ глыбакадумна спасылаецца пры гэтым на арт. 127 КПК РБ, спадзеючыся, відаць, што чытач не будзе зазіраць у гэты самы КПК. Між тым, Крымінальна-працэсуальны кодэкс аніяк не дазваляе ракіроўку следчых пракуратуры і КДБ!

«Маралісты» і «законнікі» ад Камітэта дзяржбяспекі сарамліва замоўчваюць тыя акалічнасці, што 19-гадовая Іна вучыцца на трэцім курсе педуніверсітэта, што яна гадавалася адна без бацькоў. Адзіную надзейную апору, каханага мужа, спецслужбы кінулі за краты толькі за тое, што ён не любіць аднаго чалавека, а любіць сваю краіну і жонку. І вось тут «подсуетились» апекуны з «жоўтага дома». У любога нармальнага дарослага чалавека позва ў КДБ выклікае непрыемныя пачуцці і трывогу. Тым больш, што беларускі КДБ ужо даўно стаў заяўляць пра сваю вернасць традыцыям Дзяржынскага і ягоных наступнікаў... Пра што ж хацелі даведацца «таварышы» ў маладой дзяўчыны-сіраты аж на пяці допытах? У безабароннага можна ж не толькі «даведацца». Тут магчыма атрымаць і прызнанні пра пракапаны з Бамбея ў Лондан тунэль, а не тое што пра нейкае там крымінальнае злачынства.

Нешта сёння на Беларусі «слаўныя чэкісты» займаюцца дзіўнаватымі справамі. Нехта падрывае прэзідэнцкага кантралёра, а арыштоўваюць 73-гадовага гаспадарніка. Забіваюць дырэктара Коласаўскага тэатра, а высокапастаўленыя афіцэры КДБ арганізуюць вобыскі на кватэры журналіста Б.Хамайды і выклікаюць на допыт палітолага У.Падгола за падрыхтоўку да публікацыі непажаданай для прэзідэнта кнігі... Тыя, хто ўмее пісаць на платах толькі словы з трох літараў, валам валяць у высокааплатны прэзідэнцкі БПСМ, а для сапраўдных юнакоў-патрыётаў Беларусі КДБ задарма рыхтуе месцы на турэмных нарах.

Вядома, можна зразумець стан людзей, вымушаных адпрацоўваць дзеля пракорму сваіх сем'яў грашы, кінутыя з панскага стала. Але ж навошта пры гэтым нацягваць на сябе манты справядлівых суддзяў ды нязграбна гуляць ролю клапатлівых бацькоў, маралістаў ды законнікаў?

Прэс-служба БНФ «Адраджэнне»

СВАБОДА
18 лістапада 1997 г., № 127

Александр СТАРИКЕВИЧ

Тусовка

«Я тебя слепила из того, что было, а потом что было, то и полюбила». Этот незамысловатый припев шлягера российской певички прочно ассоциируется с тем, что у нас принято называть «объединенной оппозицией».

Прошел год с момента позорной сдачи всех и вся руководством Верховного Совета и Конституционного суда. Но и сегодня те, кто в ночь с 21 на 22 ноября заключал «минский мир», возглавляют «борьбу с узурпатором Лукашенко».

Неудивительно, что воз и ныне там.

Белорусские политики любят порассуждать на тему о психическом здоровье Александра Лукашенко. Однако создается впечатление, что президент Беларуси нормальнее многих из них. Впрочем, поведение столпов оппозиции проще всего было бы объяснить массовым умопомрачением. На самом деле, как это ни парадоксально, сложившаяся ситуация их устраивает.

«Верховный Совет является стержнем оппозиции», — заявляет его руководитель Семен Шарецкий. С него и начнем.

Оказывается (как следует из недавнего интервью этого блестящего и деятельного политика), Шарецкий и поныне не считает ошибкой результаты переговоров с российской делегацией накануне ноябрьского референдума. Разъяснить популярно свою точку зрения он не может, потому что *«причисляет себя к политикам, которые должны смотреть в будущее, а не в прошлое»*. Тем временем «Свободные новости» опубликовали фантастическое откровение Эрики Манн, председателя делегации по связям Европарламента с Украиной, Беларусью и Молдавией. Во время встреч с ней *«представители оппозиции сетовали на то, что Европейский союз перед референдумом действовал неумно»*. Вот, оказывается, кто во всем виноват. Уж чего-чего, а наглости нашим оппозиционерам точно не занимать. Правда, проявляется она почему-то только в разговорах с потенциальными союзниками.

Перейдем к достижениям Верховного Совета и лично его председателя за минувший год. В формулировке Шарецкого они укладываются в единственную фразу: *«Легитимность Верховного Совета признана в цивилизованном мире, и депутаты продолжают работу»*.

Образцом этой работы может служить история с докладом комиссии ВС по расследованию деятельности Лукашенко. Как известно, Шарецкий заявил следователю прокуратуры, что Верховный Совет не уполномочивал Гончара на проведение данного расследования. Затем на протяжении длительного времени президиум уклонялся от созыва собрания депутатов, на котором предполагалось заслушать доклад комиссии. Ответные действия Гончара со товарищи были столь же невразумительными. Фракция «Гражданское действие» выступила со специальным заявлением, в котором публично выразила недоумение по поводу позиции спикера парламента. В качестве крайней меры члены ОГП не исключали возможности инициирования вопроса о добровольной отставке Шарецкого. Мышиная возня, которую затеяли между собой защитники Конституции 1994 года, вероятно, очень забавляет Лукашенко. Не случайно он обмолвился, что такую оппозицию нужно беречь и подкармливать.

Похоже, большинство депутатов окончательно утратило чувство реальности. Мелкое интриганство друг против друга, начавшееся еще в Овальном зале Дома правительства, продолжается по сей день. Объединенная оппозиция напоминает коммунальную квартиру, жильцы которой все силы тратят на перманентную междоусобную свару. Время от времени парламентариям приходится прерываться, чтобы сделать очередное заявление об опасности фашизма в Беларуси.

То, что происходило во время последнего заседания Верховного Совета, вообще не поддается никакому описанию. Шарецкий и Шушкевич, Калякин и Нистюк дружно объясняли всем присутствующим, что постановление ВС по докладу комиссии Гончара не может быть принято из-за недостатка полномочий. Вот как интересно получается: как ездить по заграницам да встречаться с послами, то Верховный Совет тринадцатого созыва — «единственный легитимный законодательный орган». А как принимать сколь-нибудь значительные решения — это кружок кройки и шитья при районном доме пионеров.

Самое обидное, что среди депутатов есть нормальные порядочные люди. Всегда вызывает уважение по-настоящему мужская позиция Владимира Башарымова и некоторых его коллег. Но в целом Верховный Совет тринадцатого созыва сегодня превратился в политический приют для Семена Шарецкого, Станислава Шушкевича и иже с ними. Для этой группы сегодня важнейшей задачей является удержаться на своих местах. Деньги, пусть и очень небольшие, им дают только до тех пор, пока не появится реальная оппозиционная сила. Естественно, что Верховный Совет в лице своих предводителей в этом никак не заинтересован.

Кстати, значение этого, с позволения сказать, органа сильно преувеличивается. Как заклинание, повторяется довод о том, что в случае падения Лукашенко власть перейдет к Верховному Совету. Это уже даже не наивность. Это миф, созданный придворными пропагандистами, которые также прекрасно понимают: если ситуация изменится, они точно так же будут никому не нужны, как и подонки с государственного телевидения, которые сегодня глумятся над костями жертв сталинских расстрелов.

Власть у Лукашенко необходимо забрать. И тот, кто окажется способен на это, ни за что не передаст ее столь бездарным и бесполезным людям. Теоретически можно допустить, что этот Верховный Совет может когда-нибудь на что-нибудь сгодиться. Но какие существуют основания полагать, что тот же Шарецкий в решающий момент поведет себя иначе, чем год назад? Ведь и ныне *«магистральная линия Верховного Совета, от которой никому не будет позволено отойти»*, заключается в планомерном торпедировании решений, которые должны были быть приняты еще полтора года назад.

Среди других составляющих объединенной оппозиции выделяются БНФ, ОГП и ПКБ. Фронт постепенно приобретает все те же пороки, которые свойственны прочим оппозиционным структурам. Но о том, что происходит в этой организации, — разговор особый и в отдельной статье.

ОГП унаследовала все пороки своей предшественницы ОДПБ, которая всю жизнь отличалась невероятными амбициями, ничем не подкрепленными, и редким даже по меркам белорусской политической сцены склочничеством. Единственное, что изменилось с приходом в партию Геннадия Карпенко, Станислава Богданкевича, Виктора Гончара и Василия Шлындикова, — раздрай вышел на качественно новый уровень. Выяснение отношений между претендентами на первенство уже давно вышло за рамки внутрипартийной дискуссии и полностью поглотило его участников. Естественно, им тоже не до Лукашенко. Тем паче, что лидеры нации, как недавно выяснилось, назначаются на съезде ОГП.

А с представителей ПКБ впору сдувать пылинки. Дескать, они ведь до сих пор не перешли в стан Лукашенко, несмотря на недовольство российских товарищей. И вообще порядочно себя ведут: если не собираются поддерживать конкретные шаги антипрезидентской оппозиции, то обязательно заранее оповестят об этом через прессу устами своих глашатаев. Последние нам еще и объяснят, что ни в коем случае не нужно обижаться на героических коммунистов, ведь им угрожают отлучением от российских единомышленников. Да еще, не дай Бог, сами коммунисты обидятся и уйдут, а тогда оппозиция не будет объединенной.

Многие из вышеупомянутых гордятся тем, что не пошли на компромисс с властью. Что ж, за это они вполне достойны почетной грамоты Верховного Совета за подписью Семена Шарецкого. Но если вся оппозиционность политиков (подчеркиваю: политиков, а не рядовых избирателей) заключается в словесном фрондировании «ненавистному режиму» и не подкрепляется конкретными делами — грош им цена в базарный день.

И называется это не оппозиция, а тусовка. Тусовка, которая ничего не умеет и ничего не может. И до тех пор, пока она будет подменять собой реальную оппозицию, Лукашенко может спать спокойно.

Достаточно взглянуть на список наших активных «оппозиционеров» и вспомнить, кто они были и есть. Председатель колхоза, не раз публично горевавший о развале СССР, павшего, по его убеждению, жертвой всемирного сионистского заговора. Лидеры партии, истребившей десятки миллионов невинных людей и продолжающей отстаивать «социалистические ценности». И экземпляры помельче типа комсомольского «вожака», перебежавшего в свое время к Лукашенко, затем вышвырнутого из его окружения и за неимением лучшего прибившегося к обществу любителей Конституции 1994 года. Это оппозиция? Увольте.

Даже если вообразить, что наступит день и час, когда эти люди придут на смену Лукашенко, легче на душе не становится. Кто-нибудь в состоянии представить себе, что с ними можно построить новую, суверенную, благополучную Беларусь? Из заведомо негодного материала нельзя сделать конфетку. Эту истину всем нам необходимо усвоить.

Наша весна еще впереди

Ноябрь стал месяцем пристального внимания мировой общественности к Беларуси. Сначала Комитет ООН по правам человека отметил, что у граждан Беларуси стало даже меньше прав, чем было пять лет назад. Затем в Минск приехала Международная комиссия неправительственных организаций, которая констатировала: в Беларуси людей, которыми гордилась бы любая страна, подвергают публичному шельмованию и уголовному преследованию. Речь шла о руководителях фонда «Детям Чернобыля» Геннадии и Ирине Грушевых, вынужденных скрываться от белорусского неправосудия за рубежом. И, наконец, в прошлый четверг немецкий Бундестаг провел парламентские слушания по поводу ситуации в Беларуси.

Эксплуататор страхов

В основном тональность выступлений и оценок участников этих мероприятий совпадает. Но, пожалуй, наиболее резко и концентрированно высказался депутат немецкого парламента Герт Вайскирхен, выступая по проекту Постановления Бундестага о ситуации в Беларуси. Он оценил ситуацию однозначно: демагогически спекулируя на трудностях переходного периода, Лукашенко эксплуатирует социальные страхи людей, а их энергию направляет на создание образов врагов.

Вайскирхен констатирует: в Беларуси образцами поведения, как и в советские времена, остаются предательство и подчинение. Присвоив власть, Лукашенко сам решает, кто враг, а кто друг. Манипулируя таким инструментом демократии, как референдум, он совершил «государственный переворот сверху», упразднив свободно избранный парламент, уволил судей Конституционного суда и назначил новых.

По словам Вайскирхена, Лукашенко *«виртуозно владеет клавиатурой завоевания и удержания власти советского типа»*. Он раскалывает общество на противников и послушных, подпитывая агрессивные настроения. В стране кризис, а он же его и подогревает, потому что он сам, его авторитарный режим является одной из причин этого кризиса. Политически он может существовать только до тех пор, пока остается психологическое чрезвычайное положение.

Понимая, что ему не удержаться, если он останется в узком кругу власти, он пытается *«перепрыгнуть в тьму утопии о слиянии Беларуси и России»*. Он заводит ту же песню, что уже звучала при распаде СССР. Она напоминает о настроениях, царивших в советской империи, реанимирует великорусскую идею.

В Лукашенко видят шанс для себя национал-коммунисты, левые и правые экстремисты в российской Думе. Его Союз нашел действенную опору в устремлениях к славянской соборности Русской православной церкви у Патриарха Алексия II и митрополита Минского Филарета. Себе же Лукашенко весьма нравится в роли великого интегратора, объединителя всех славян.

Но Лукашенко в своих действиях небезупречен, его слабость становится все более очевидной, прозвучало в зале Бундестага. Все ощутимей становится сопротивление диктатору. Несмотря на интенсивные усилия, ему не удалось развить союз с Россией: весь громкий пафос завершился слабым текстом договора, зафиксировавшим в большей степени намерения, нежели обязательства.

И дело даже не в том, что экономика Беларуси в провале, а зарплата нижайшая. Сама по себе страна по сравнению с Россией выглядит последним бастионом социализма и воплощает в себе все то, против чего борется российская демократия.

Осень диктатора еще не наступила, и он стремится уничтожить демократический потенциал белорусского общества. Немецкий Бундестаг, заявил Вайскирхен, солидарен с белорусскими общественными инициативами. Депутаты Бундестага поддерживают всех демократов в Беларуси и предупреждают президента Лукашенко: семья европейских демократий не станет равнодушно наблюдать, как подавляют члена общей семьи.

Как можно понять, выступление депутата от социалистической фракции было эмоциональным и жестким. Характеристики режима, данные им, исчерпывающи. Это, конечно, результат заинтересованного отношения к Беларуси, но и во многом — той деятельной энергии, с которой опальная белорусская демократия борется за будущее страны.

Быть не может?! У нас может

Белорусский Хельсинкский Комитет предоставил нам стенограмму дискуссии в Комитете ООН по правам человека. Многими членами Комитета официальный доклад, который представляла замминистра иностранных дел Н. Мазай, был признан неадекватным. Речь в нем в основном должна была идти о соблюдении в Беларуси гражданских и политических прав, а докладчики попытались скрыть и оправдать бесправие.

Например, Эккарт Кляйн (Германия) остановился на прошлогоднем политическом кризисе: *президент вышел из него благодаря полному пренебрежению принципом разделения властей*. Томас Бергенталь (США) задал риторический вопрос: *какие соображения легли в основу изменений полномочий КС помимо тех, чтобы развязать руки президенту и поставить его вне контроля судебных властей?*

Странные западные идеалисты, они спрашивают: *а правда ли, что тайная полиция имеет исключительные полномочия и подчиняется только президенту? А правда, что тайная полиция собирает досье на лидеров оппозиции и преследует их?* Можно, конечно, сказать, что неправда. А можно и так: правда, но это — исполнение воли народа.

Г-н Мартин Шейнин из Финляндии горячится: *действительно ли президент может увольнять судей? Правда ли, что правозащитники преследуются?* Татьяну Протько, председателя БХК, арестовали накануне заседания Комитета по правам человека. Может ли быть ответ более лаконичным и выразительным?

А в общем, нудные люди, эти западные демократы. Максвелл Ялден (Канада) не понимает: *как адвокат может быть независимым, если его лицензирует государственный орган (минюст)?* У нас может.

Элизабет Эватт из далекой Австралии заинтересовал вопрос: *правда ли, что оппозиционеры не имели доступа на государственные электронные СМИ, а негосударственные радиостанции были закрыты?* Правда, г-жа Элизабет: не только оппозиционеры, но и спикер парламента эфира не имел.

Акценты и оценки самых разных людей совпадают: Беларусь идет к жесткой диктатуре. Прискорбно, но факт. И — руководство к дальнейшему действию для оппозиции.

Константин СКУРАТОВИЧ

Не зря он родился в СССР

